для пчел и может быть использован в качестве лечебно-профилактического препарата в пчеловодстве.

УДК 619:616.33-008.3:636.2.053

## ПАТАМАРФАЛАГІЧНЫЯ ЗМЕНЫ ОРГАНАЎ СТРАВАВАННЯ ПРЫ ДЫСПЕПСІІ ЦЯЛЯТ АЛІМЕНТАРНАГА ХАРАКТАРУ

**Харытонік Дз. М., Туміловіч Г. А., Ламан А. М., Грышчук С. В., Сянько А. А., Картэль К. С.**

УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

На дадзены момант навукоўцамі і практыкамі застаецца не вырашанай праблема захаванасці цялят у першыя тыдні іх жыцця, паколькі ў гаспадарках не ўлічваюцца фізіялагічныя патрэбы нованароджаных і невыконваюцца тэхналагічныя рэгламенты [1, 2].

Мэта даследаванняў – вызначыць патамарфалагічныя змены тонкага кішэчніку цялят пры дыспепсіі аліментарнага паходжання.

Навукова-вытворчыя даследаванні па рашэнні пастаўленай мэты выконваліся ў 2016-2017 гг. ва ўмовах СВК «Прагрэс-Верцялішкі» Гродзенскага раена, ГП «Галынка» Зэльвенскага раёна, КСУП э/б «Пагародна» Воранаўскага раёна і марфалагічнай лабараторыі кафедры анатоміі жывёл УА «ГДзАУ». Аб'ектам даследаванняў служылі загінуўшыя цяляты ва ўзросце 2-7 дзён. Вірусныя і бактэрыяльныя інфекцыі былі лабараторна выключаны. Матэрыялам для гісталагічных даследаванняў служылі ўзоры сценак дванаццаціперснай, худой, падуздышнай кішкі тонкага аддзела кішэчніка. Пры адборы матэрыялу імкнуліся да максімальнай стандартызацыі прэпаратыўных працэдур пры фіксацыі, праводцы, заліванні, падрыхтоўцы парафінавых і крыястатных зрэзаў.

Пры гісталагічным даследаванні тонкага аддзела кішэчніка змены насілі ачаговы або дыфузны характар. Ва ўсіх выпадках захворванняў выяўляюцца змены ў структурах слізістай абалонкі. У покрыўным і жалезістым эпітэліі назіраецца крупчастая і слізістая дыстрафія, а ў сасудзіста-страмальных тканках на фоне мікрацыркуляторных парушэнняў – кровазліцця, ацёкласць і паўнакроўе сасудаў.

Пры цяжкай клінічнай праяве хваробы выяўляецца клініка дэскваматыўнага катару, або сярозна-гемарагічнага гастраэнтэрыту. Адзначаецца слаба выяўленая інфільтрацыя слізістай абалонкі і



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

падслізістай асновы лімфацытамі, гістыяцытамі, монацытамі, плазматычнымі клеткамі і адзінкавымі лейкацытамі. У асобных выпадках адзначалі ачаговы павярхоўны някроз слізістай абалонкі з наступным фарміраваннем эрозій і язваў.

У дванаццаціперснай кішцы ў большасці выпадкаў адзначалі ўкарачэнне кішэчных варсінак. У асобных выпадках назіралі ачаговы някроз варсінак і залоз паблізу ўласнай пласцінкі слізістай абалонкі, а ў тых, што захавалі залозістыя структуры, адзначалі дэсквамацыю эпітэліяльных клетак. Месцамі паміж залозістых структур выразна вымалёўваецца інфільтрацыя сярозным эксудатам і клеткавымі элементамі, сярод якіх сустракаюцца адзінкавыя эазінафілы, плазмабласты і плазматычныя клеткі.

Глыбокія дуадэнальныя залозы цалкам захоўваюць эпітэліяльны пласт, у іх поласцях выяўлялі сакрэт, які афарбаваны нераўнамерна. Вакол залозістых структур выяўляюцца праліфераты, якія прадстаўлены макрафагамі, плазмацытамі, лімфацытамі. У мышачнай абалонцы цыркулярныя і падоўжаныя мышачныя валокны не маюць дакладных межаў. Ядры міяцытаў нераўнамерна афарбаваны, выцягнутай формы, размешчаныя ў выглядзе ланцужка. Сярозная абалонка патоўшчана, частка клетак мезатэлію падвяргаецца адрыванню.

У падуздышнай кішцы адзначаецца характэрная карціна скарачэння і разбурэння паверхневых слаёў варсінак. Выяўляецца дэсквамацыя покрыўнага і залозавага эпітэлія, кровазліцця ў тканках слізістай абалонкі і падслізістага пласта, разрэджанасць лімфоідных клетак у пейеравых бляшках, інфільтрацыя ўсіх слаёў сценкі кішкі лейкацытамі, нешматлікімі макрафагамі і плазматычнымі клеткамі.

У худой кішцы найбольшыя змены назіралі па выступах цыркулярных зморшчын, на верхавінах якіх выразна бачны разбурэнні аднаой трацін кішэчных залоз. У захаваўшыхся участках слізістай абалонкі крыпты ўтрымліваюць слізь і дэсквамаваныя эпітэліяцыты ў выглядзе бакалападобных экзакрынацытаў. У такіх участках паміж залозістых структур вызначаюцца праліфераты, на месцы разбураных залоз ў выглядзе зноў узнікаючых крыпт з невыразнымі абрысамі прасвету. У глыбіні слізістай абалонкі знаходзілі залозы, прасветы якіх мелі розную велічыню з фарміраваннем кістозных поласцей, унутраная сценка якіх выслана плоскім эпітэліем. Сасуды рэчышча рэзка пашыраны і забіты эрытрацытамі, што паказвае на з'явы застойнай гіперэміі і стаза.

Вынікі даследаванняў паказваюць, што найбольшыя патамарфалагічныя змены адзначаюцца ў худой кішцы тонкага аддзела кішэчніка. На нашу думку, масавае захворванне цялят дыспепсій



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

у першыя тыдні жыцця абумоўлена нарушэннямі ўмоў утрымання, кармлення і ступенню фізіялагічнай сталасці пры нараджэнні.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Сулейманаў, С. М. Функцыянальная марфалогія органаў стрававання і эндакрынных залоз в норме і пры дыспепсіі: аўтареф. ... дыс. докт. вет. навук: 16.00.02 / С. М. Сулейманаў; Казанскі ветэрынарны ін-т ім. Н.Э. Баўмана. – Казань, 1981. – 46 с.
2. Туміловіч, Г. А. Структурна-функцыянальная арганізацыя стрававальнага тракта цялят: манаграфія / Г. А. Туміловіч, Дз. М. Харытонік. – Гродна, 2015. – 275 с.

УДК 636.597.053.087.7:631.735(476.6)

## МОРФОЛОГИЧЕСКИЕ ИЗМЕНЕНИЯ ГРУДНЫХ МЫШЦ ЦЫПЛЯТ-БРОЙЛЕРОВ ПРИ ПРИМЕНЕНИИ ПРЕПАРАТА «ЧИКТОНИК»

**Харитоник Д. Н., Тумилович Г. А., Чернов О. И., Ламан А. М.**

УО «Гродненский государственный аграрный университет»
г. Гродно, Республика Беларусь

Интенсификация птицеводства требует глубоких знаний морфологии, физиологии и биологии птиц. Быстрый рост и развитие цыплят-бройлеров, высокая продуктивность и острые реакции на смену внешних условий вызывают необходимость интегральной оценки процессов миогенеза в постнатальном онтогенезе. Это позволит уточнить критические моменты и особенности морфологической дифференцировки мышц, следовательно, рационально, с меньшими затратами организовать полноценное и сбалансированное кормление цыплят-бройлеров, увеличить продуктивность, качество продукции и рентабельность производства [2, 3].

Исследования проводили на базе СПК «Прогресс-Вертелишки» Гродненского района Гродненской области. Формирование групп цыплят-бройлеров кросса «Росс-308» осуществляли по принципу групп-аналогов по 100 голов в группе с учетом известного происхождения, возраста, упитанности, пола, физиологического состояния, живой массы. В зависимости от целей и задач опытов возраст птицы составлял от суточного до 42 дней. Условия содержания, кормления контрольной и опытной групп были одинаковыми и соответствовали рекомендациям. «Чиктоник» применялся с питьевой водой 1 раз в день с 3 по 10 день выращивания в дозе 1 мл на 1 л воды. Объектом исследования выступали грудные мышцы.

Мышечная система цыплят-бройлеров, как и у других видов животных и птиц, представлена тремя группами мышц: а) неисчерченная



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ